ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (1135) ● Чацвер, 17 чэрвеня 1976 г. ● ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

*Сёння ў нумары:*

**УРАЧЫСТАЯ СУСТРЭЧА Ў БДУ ● СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ ● У АЎДЫТОРЫЯХ ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ ● ГРУПА, У ЯКОЙ ЦІКАВА ● ПРАБЛЕМЫ САЦЫЁЛАГАЎ ● КНІЖНЫЯ ВЫСТАЎКІ БДУ ● ІНТЭРФАКУ — 15 ГОД.**

НАВІНЫ

## УВАГА — ВЫХАВАННЮ СТУДЭНЦТВА

У БДУ з 15 па 17 чэрвеня працавала навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Праблемы камуністычнага выхавання моладзі». У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі многіх ВНУ БССР і іншых рэспублік. У ліку дакладчыкаў — вучоныя з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР) Г. Кафенбергер, Г.-В. Батке, Г.-Г. Ешке.

## ПРАВЕДЗЕН РЭЙД

Звыш 200 выкладчыкаў і студэнтаў БДУ прыняло ўдзел у агульнараённым рэйдзе, праведзеным Кастрычніцкім райкомам партыі. Рэйд быў прысвечан выяўленню і выкараненню прычын п'янства і парушэнняў грамадскага парадку.

Прадстаўнікі універсітэта — удзельнікі рэйду — праверылі стан грамадскага парадку на Прывакзальнай плошчы, на вул. Бабруйскай, абмеркавалі работу ДНД — народнай дружыны БДУ, праверылі прапускны рэжым у інтэрнаце па вул. Курчатава, захаванасць асабістых рэчаў студэнтаў у вучэбных карпусах, санітарны стан тэрыторыі універсітэцкага гарадка.

Рэйдам непасрэдна кіраваў створаны пры парткоме штаб, у які ўвайшлі прарэктары БДУ і партыйны актыў.

## НАРАДЖЭННЕ ФАКУЛЬТЭТА

Усяго некалькі дзён у БДУ існуе новы факультэт — радыёфізічны, створаны на базе фізічнага факультэта універсітэта ў адпаведнасці з рашэннем Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

На факультэце 4 кафедры: радыёфізікі і электронікі ЗВЧ; электрафізікі; радыётэхнікі і фізічнай электронікі; ЭММ.

У новым навучальным годзе радыёфізічны факультэт прыме на дзённае навучанне 100 студэнтаў.

НАВІНЫ

# ГНК — БАЯВУЮ ПРАГРАМУ ДЗЕЯННЯЎ

### СА СПРАВАЗДАЧНАГА ДАКЛАДА СТАРШЫНІ ГНК БДУ І. С. ЦІШКЕВІЧА

У ПАСПЯХОВЫМ рашэнні новых складаных задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС і XXVIII з'ездам КПБ, важная роля належыць органам народнага кантролю. Галоўнае, на чым яны зараз павінны сканцэнтраваць свае намаганні, — далейшае паляпшэнне праверкі выканання рашэнняў партыі і ўрада, планаў дзесятай пяцігодкі. Вялікае значэнне для паляпшэння дзейнасці органаў народнага кантролю мае пастанова ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР». Яна абмяркоўвалася на нарадзе сакратароў пярвічных партыйных арганізацый і іх намеснікаў па народнаму кантролю, двойчы — на пасяджэннях ГНК БДУ, а таксама на пасяджэннях большасці ГНК факультэтаў і іншых падраздзяленняў.

Група народнага кантролю БДУ была выбрана ў саставе 33 чалавек на канферэнцыі прадстаўнікоў універсітэта 26 снежня 1973 г. Было створана шэсць сектараў: аргработы і галоснасці, вучэбнай работы, навуковай работы, аховы сацыялістычнай маёмасці, па кантролю за матэрыяльна-бытавым забеспячэннем (сектар быту), па разгляду скаргаў і заяў. За гэтыя гады адбыліся некаторыя змены і ў кіраўніцтве, і ў самім саставе ГНК.

За справаздачны перыяд галаўная ГНК універсітэта правяла 58 праверак, прычым 18 з іх датычалі пытанняў вучэбнай і навуковай работы. На наш погляд, такія суадносіны цалкам апраўданы для навучальнай установы.

Дзейнасць сектара вучэбнай работы (кіраўнік Л. Кірыла) была накіравана на паляпшэнне якасці вучэбнага працэсу, павышэнне яго эфектыўнасці і ліквідацыю недахопаў. Праверкі праводзіліся рэгулярна, імі былі ахоплены ўсе факультэты. Вынікі праверак абмяркоўваліся членамі сектара, а затым выносіліся на пасяджэнне ГНК БДУ або бюро ГНК.

Як вядома, для павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу важнае значэнне мае распрацоўка і выданне дапаможнікаў для самастойнай работы. Праверкі ж паказалі, што, нягледзячы на ўказанні рэктарата, такія дапаможнікі распрацаваны далёка не на ўсіх факультэтах.

Пры праверцы на фізфаку і мехмаце выявілася, што маецца некаторая перагрузка студэнтаў і нераўнамернасць у размеркаванні вучэбных заняткаў па днях тыдня. Пасля праверкі вызначаныя недахопы былі ліквідаваны. Шэраг недахопаў быў выяўлен і ў выніку праверкі эфектыўнасці выкарыстання другой паловы працоўнага дня на фізічным і гістарычным факультэтах. Вынікі праверкі былі заслуханы на пасяджэнні рэктарата.

Сектар вучэбнай работы звяртаў увагу і на становчае ў справе паляпшэння якасці вучэбнага працэсу. Так, напрыклад, удачны вопыт па распрацоўцы метадычных дапаможнікаў для студэнтаў юрыдычнага факультэта быў рэкамендаван для выкарыстання на іншых факультэтах.

Сектар навуковай работы (кіраўнік М. Сакалоў) таксама праводзіў праверкі па актуальных пытаннях дзейнасці нашай установы: эфектыўнасць выканання гаспадарча-дагаворных работ на хімфаку і біяфаку, дзейнасць кафедр юрфака і журфака па кіраўніцтву работай студэнцкіх навуковых гурткоў, выкарыстанне каштоўнага абсталявання на хімфаку і г. д. У час праверак былі выяўлены недахопы, на якія была звернута ўвага кіраўніцтва адпаведных факультэтаў і кафедр. Аднак у цэлым сектар навуковай работы ў справаздачным перыядзе дзейнічаў недастаткова эфектыўна. Многія важныя пытанні выпалі з яго поля зроку.

Трэба адзначыць, што некаторыя з выяўленых недахопаў ліквідуюцца вельмі марудна або ўвогуле не ліквідуюцца. Гэта заўвага датычыцца работнікаў АГЧ і грамадскага харчавання. За справаздачны перыяд сектар быту правёў 22 праверкі сталовых і буфетаў, якія абслугоўваюць універсітэт, і 8 праверак выканання рэкамендацый і пастаноў галаўной ГНК. Арганізацыя грамадскага харчавання БДУ ў апошні час некалькі палепшылася, але поўнасцю не задавальняе членаў нашага калектыву. Прапускная здольнасць сталовых і буфетаў яўна недастатковая.

Акрамя станоўчага, ёсць хібы ў дзейнасці сектара аргработы і галоснасці (кіраўнік А. Акінчыц). Сектар, галаўная ГНК у цэлым, яе кіраўніцтва яшчэ слаба кіруюць работай некаторых груп народнага кантролю. Напрыклад, няма цеснай сувязі з ГНК доследнай гаспадаркі ў Шчомысліцах. Нашы спробы звязацца з ёй рэдка ўвенчваюцца поспехам. Слабае кіраўніцтва здзяйснялася і ў адносінах да ГНК выдавецтва і друкарні. Усё гэта ў некаторай ступені адмоўна адбілася на рабоце асобных груп.

У той жа час нядрэнна папрацавалі ГНК хімфака, біяфака, геафака, гістфака, ваеннай кафедры, ФПМ, НДІ ПФП, фізфака, філфака, журфака, упраўлення. Бюро ГНК БДУ некалькі разоў збірала нарады старшынь ГНК па найбольш важных пытаннях. Вялікую дапамогу ў арганізацыі работы ГНК аказвалі і аказваюць райком партыі і раённы камітэт народнага кантролю.

Крытычна ацэньваючы работу галаўной групы народнага кантролю універсітэта, неабходна прызнаць, што ў рабоце нашай групы маюцца недахопы: не заўсёды праяўлялася дастатковая настойлівасць у рэалізацыі рэкамендацый ГНК, не ў поўным аб'ёме выкарыстоўваліся правы, прадастаўленыя ГНК, і некаторыя іншыя.

Новаму саставу ГНК неабходна прыняць усе меры для ліквідацыі гэтых недахопаў. Народныя кантралёры павінны яшчэ больш актывізаваць сваю дзейнасць, пастаянна ўдасканальваць яе формы і метады. Трэба дабіцца такога ўзроўню работы, каб у ёй было забяспечана арганічнае адзінства праверкі, папярэджання і ліквідацыі недахопаў.

# У ДРУЖБЕ — СІЛА



У знак дружбы і павагі тут, ля манумента загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны выкладчыкам і студэнтам, былі ўскладзены кветкі. Кветкі, якія вось ужо тыдзень напамінаюць нам аб той доўгачаканай і шчырай сустрэчы, якая адбылася з украінскімі сябрамі.

У той памятны дзень гасцінна расчыніў дзверы БДУ імя У. І. Леніна. Знаёмства з пасланцамі украінскай зямлі адбылося ў зале пасяджэнняў галоўнага корпуса універсітэта. Ганаровае месца занялі паважаныя госці: загадчык аддзела культуры ЦК КПБ М. Г. Ішчанка, міністр культуры Украінскай ССР А. К. Раманоўскі, двойчы Герой Савецкага Саюза А. Н. Нядбайла, намеснік старшыні выканкома Кіеўскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Г. М. Мянжэрас, акадэмік-сакратар АН УССР А. Я. Усікаў, сакратар Саюза пісьменнікаў Украіны Герой Савецкага Саюза Ю. А. Збанацкі.

З прывітальным словам выступіў член-карэспандэнт АН БССР, рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі. Было расказана аб гістарычным шляху універсітэта, аб тым, што БДУ належыць да ліку лепшых ВНУ з 27 краін свету, аб цесных сувязях, якія існуюць у нас з Кіеўскім універсітэтам. Так, сумесныя распрацоўкі вядуцца ў галіне паўправаднікоў, наладжаны кантакты паміж географамі, філолагамі універсітэтаў.



Ад імя членаў украінскай дэлегацыі выступіў М. Г. Ішчанка, які выказаў словы падзякі за такі цёплы прыём, які аказала Беларусь брацкаму народу.

Акадэмік-сакратар АН УССР А. Я. Усікаў выказаў упэўненасць, што гэтая сустрэча паміж брацкімі народамі будзе залогам вечнай і непарушнай дружбы.



— Справа ў тым, што мы не пасняваем сустрэцца з тымі, з кім бы хацелі. Але гэта не апошняя дэкада, — так пачаў сваё выступленне пісьменнік Ю. А. Збанацкі. Ён коратка спыніўся на стане літаратуры Украіны, на тым, што дзесятая пяцігодка парадуе нас не толькі працоўнымі подзвігамі, але і выдатнымі літаратурнымі творамі.

У канцы святочнага пасяджэння ад імя ўсяго калектыву універсітэта гасцям быў уручан камплект Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. У сваю чаргу украінскія сябры падарылі універсітэту 26 тамоў «Гісторыі УССР».

Затым адбылося знаёмства гасцей з факультэтамі, лабараторыямі, кабінетамі, навуковымі аддзеламі бібліятэкі універсітэта, з аўтаматызаваным класам эксперыментальнай вылічальнай навучаючай сістэмы ЭВАС.

**Г. СІДАРОВІЧ,**
**студэнтка II курса журфака.**

**На здымках:**

Украінскія госці і прадстаўнікі БДУ ўскладаюць кветкі да памятнага мемарыяльнага Знака выкладчыкам і студэнтам універсітэта, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны; ідзе ўрачыстае пасяджэнне; у аўтаматызаваным класе ЭВАС.

Фота **Л. Марцыёнкі.**



# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

**У МАІ Г. Г. У БДУ ПРАЙШЛА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА НАРОДНАМУ КАНТРОЛЮ. СЁННЯ МЫ ДРУКУЕМ МАТЭРЫЯЛЫ З ГЭТАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ.**

## НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ ХІМФАКА

Як адзначалася ў дакладзе старшыні ГНК хімфака Г. Васільевай на справаздачна-выбарнай канферэнцыі, у сваёй рабоце народныя кантралёры кіраваліся «Палажэннем аб органах народнага кантролю СССР» і пастановай ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР».

Кантралёры правяралі вучэбна-метадычную работу раду кафедр. Было заўважана, што вучэбна-метадычнай рабоце ў меншай ступені ўдзялялася ўвага на вячэрняй і завочнай формах навучання. Недастатковае распаўсюджанне атрымала такая форма, як справаздача выкладчыкаў аб сваёй рабоце на пасяджэннях кафедр. Плануемыя мерапрыемствы ў шэрагу выпадкаў насяць агульны, неканкрэтны характар.

Група народнага кантролю праверыла забяспечанасць студэнтаў факультэта падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, цікавілася станам кантролю за бягучай паспяховасцю студэнтаў з боку дэканата і кафедр. Было рэкамендавана ўносіць разгляд пытанняў бягучай паспяховасці ў планы работы метадычных камісій, шырэй выкарыстоўваць праграміраваную форму кантролю ў працэсе навучання.

Значную ўвагу ўдзяляла група стану працоўнай дысцыпліны на факультэце. Сумесна з прафбюро неаднаразова праводзіліся праверкі прыходу і ўходу супрацоўнікаў на работу і з работы. Вынікі праверкі шырока абмяркоўваліся на прафсаюзным сходзе.

У полі зроку ГНК — жыллёва-бытавыя ўмовы студэнтаў—жыхароў інтэрната. Быў выяўлен рад недахопаў у абслугоўванні студэнтаў, акты абследавання былі накіраваны ў партком і АГЧ.

Вынікі праверак асвятляліся ў «Камсамольскім пражэктары». Паўторныя рэйды народных кантралёраў па інтэрнату паказалі, што шэраг рэкамендацый групы быў выканан.

ГНК сістэматычна праводзіла праверкі сталовай і буфета хімічнага корпуса. Дзякуючы намаганням групы ў апошні час работа прадпрыемстваў грамадскага харчавання некалькі палепшылася, але толькі некалькі. Зняты з работы буфетчыца (інтэрнат № 6) і загадчыца вытворчасці сталовай хімкорпуса. Паспяховае вырашэнне пытанняў харчавання патрабуе сумесных намаганняў грамадскіх арганізацый факультэта, дзейснай дапамогі адміністрацыі універсітэта.

Члены групы неаднаразова правяралі стан вучэбных аўдыторый.

ГНК цікавілася ходам будаўніцтва і ўводам у строй хімічнага склада ў Шчомысліцах.

Народныя кантралёры правяралі сумесна з прафбюро эканомію ў выкарыстанні хімічных рэактываў і посуду на факультэце. За нядобрасумленныя адносіны да выконваемых абавязкаў лабарант хімічнага склада І. Карнееў вызвален ад займаемай пасады.

ГНК хімфака працавала пад непасрэдным кіраўніцтвам партбюро факультэта. Група падтрымлівала сувязь і з дэканатам. Для павышэння якасці праверак да іх правядзення прыцягваліся прафесарска-выкладчыцкі састаў, а таксама работнікі розных падраздзяленняў універсітэта. Вынікі праверак знаходзілі асвятленне на стэндзе ГНК, абмяркоўваліся на партсходах. Аднак рэзультатыўнасць праверак не заўсёды была высокай; некаторыя праверкі толькі фіксіравалі недахопы

Новаму саставу ГНК неабходна ўлічыць накоплены вопыт работы і быць больш настойлівым, дабівацца безумоўнага выканання сваіх рэкамендацый.

**М. ПАЎЛОВІЧ.**

## РАБОТА АДКАЗНАЯ

За справаздачны перыяд ГНК біялагічнага факультэта было праведзена больш 30 рэйдаў. Пры складанні плана работы ўлічваліся два моманты: па магчымасці больш поўны ахоп усіх бакоў дзейнасці (вучэбнай, навуковай, метадычнай, адміністрацыйна - гаспадарчай) супрацоўнікаў факультэта і вылучэння асноўных, найбольш важных пытанняў, каб пазбегнуць перагрузкі плана. Гэта давала магчымасць глыбока прааналізаваць разглядаемыя пытанні. Аб ускрытых недахопах станавілася адразу вядома грамадскасці, дэканату, бо вынікі праверак рэгулярна вывешваліся на стэндзе народнага кантролю, асвятляліся «Камсамольскім пражэктарам».

Паляпшэнне работы многіх падраздзяленняў факультэта, матэрыяльнага забеспячэння кафедр і лабараторый рэактывамі і сучасным абсталяваннем, стварэнне радыеізатопнай лабараторыі немагчыма без садзейнічання адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта.

Рад недахопаў ліквідаван, аднак многія так і засталіся неліквідаванымі. Гэта датычыцца работы сталовай хімічнага корпуса.

Нельга не ўказаць і на недахопы ў рабоце самой групы. Слабы ўдзел ў яе дзейнасці прымалі студэнты факультэта. Недастаткова адлюстроўваліся ў друку скрытыя недахопы, недастатковым быў і кантакт з прафбюро біяфака і ГНК хімфака.

Работа народнага кантролю адказная і шматгранная. І вельмі важна не толькі ўскрыць недахопы, але і дапамагчы іх ліквідаваць.

**Я. ТАРАСЕВІЧ,**
**член ГНК біяфака.**

## ГАЛОСНАСЦЬ— У ЦЭНТР УВАГІ

З 10 па 20 мая ва універсітэце праходзіў V агляд стану галоснасці ў рабоце груп народнага кантролю. У аглядзе прымалі ўдзел ГНК факультэтаў, АГЧ, ваеннай кафедры і іншыя.

Асноўная ўвага пры правядзенні агляду была звернута на тое, як афармлены стэнды народнага кантролю, як у іх адлюстроўваецца дзейнасць ГНК. Улічвалася рэгулярнасць выступленняў старшынь груп на партыйных і прафсаюзных сходах, перыядычнасць выступленняў кантралёраў у друку.

Вынікі агляду паказалі, што лепш за ўсё справы абстаяць на хімічным і біялагічным факультэтах. Тут рэгулярна вывешваюцца пастановы, прынятыя па выніках праверак. ГНК працуюць у цесным кантакце з «Камсамольскім пражэктарам».

Добра выкарыстоўваецца галоснасць ГНК ВЦ, геаграфічнага, гістарычнага факультэтаў, журфака. Аднак некаторыя групы не маюць нават спецыяльных стэндаў народнага кантролю. Гэта мае месца на юрыдычным, фізічным факультэтах і ФПМ.

У выніку агляду камісія размеркавала месцы наступным чынам:

1-е і 2-е месцы падзялілі ГНК хімічнага і біялагічнага факультэтаў.

3-е месца за ГНК вылічальнага цэнтра.

**А. АКІНЧЫЦ,**
**намеснік старшыні ГНК БДУ.**

## *МОВАЙ ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ*

**Усяго па універсітэту у красавіку—маі г. г. прайшла 21 справаздачна-выбарная канферэнцыя. У рабоце выбарнай кампаніі прынялі ўдзел 1871 чалавек. На канферэнцыях выбрана 30 груп народнага кантролю. У ліку выбраных членаў ГНК — 41 студэнт, 217 служачых, 4 рабочыя. Сярод іх 96 членаў і кандыдатаў у члены КПСС. Усяго ў ГНК выбраны 263 народныя кантралёры.**

**Рэктарат, партком і мясцком універсітэта ўзнагародзіў Ганаровымі граматамі ГНК хімічнага (старшыня Г. Васільева) і біялагічнага (старшыня Я. Тарасевіч) факультэтаў, народных кантралёраў А. Акінчыц, А. Андрэева, Л. Кірылу, М. Кнігу, Л. Пясткоўскую, Я. Тагунова і І. Цюніс. Алена Андрэеўна Акінчыц узнагароджана таксама Ганаровай граматай Камітэта народнага кантролю СССР.**

## ДА ВЫНІКАЎ ПРАВЕРКІ

### НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

Бюро універсітэцкай групы народнага кантролю, заслухаўшы і абмеркаваўшы інфармацыю сектара быту універсітэцкай ГНК па выніках праверкі сталовых галоўнага і хімічнага карпусоў, сталовай № 33 і буфетаў, адзначае наступнае.

Па сталовай галоўнага корпуса БДУ: прадукты захоўваюцца ў халадзільніках, сапсаваных прадуктаў не выяўлена. Вагавая гаспадарка адпавядае патрабаванням камітэта стандартызацыі.

Тэхналогія падрыхтоўкі стравы захоўваецца, абеды выкладчыкам і студэнтам адпускаюцца своечасова, выхад страў адпавядае меню, асартыментны мінімум захоўваецца.

Аднак санітарны стан харчблока — кухні і падсобных памяшканняў — нездавальняючы. Сталы для рэзкі хлеба, нажы, падлога, вокны, падаконнікі, панелі і дзверы брудныя. У складзе для захоўвання сыпучых прадуктаў захоўваюцца флягі, маянез. Некаторыя прадукты захоўваюцца ў падсобным памяшканні.

Па сталовай і буфету хімічнага корпуса: усе памяшканні сталовай, мыечная, калідоры, склад загрувашчаны тарай. Булачныя і кандытарскія вырабы ў буфеце захоўваюцца разам з тарай. Падносы ў буфеце брудныя.

Малочныя прадукты, мяса для рэалізацыі свежае. Асартымент у абедзеннай зале ў дастатковай колькасці, але адсутнічае яйцо варанае і чай.

Праведзена кантрольнае ўзважванне 10 порцый ежы, адхіленняў ад нормы няма.

Па буфету і сталовай № 33: якасць харчавання — здавальняючая. Выхад гатовай ежы адпавядае ўказаным выхадам па меню. Пры кантрольным узважванні порцый траскі пад марынадам, мяса заліўнога, смятаны, селядзёўкі адхілення ад нормы няма. Асартыментны мінімум захоўваецца.

Трэба адзначыць недастатковы кантроль з боку медперсаналу паліклінікі БДУ за санітарным станам указаных харчблокаў.

Для паляпшэння работы сталовых і буфетаў неабходна:

Па сталовай галоўнага корпуса БДУ: прывесці ў належны санітарны стан кухню і падсобныя памяшканні сталовай, сталы для рэзкі хлеба і нажы.

Своечасова вывозіць тару, не загрувашчваць складскія памяшканні.

Па буфету і сталовай хімічнага корпуса: устанавіць пасудамыйную машыну. Устанавіць тэрмастаты для чаю і кавы (у буфеце). Адрамантаваць электраручнік і ўключыць ваду ва ўмывальных ракавінах для наведвальнікаў. Устанавіць халадзільную камеру для буфета. Своечасова вывозіць тару з памяшканняў сталовай. Акуратна і своечасова выціраць сталы ў абедзеннай зале. Забяспечыць сталы сурвэткамі.

Па сталовай № 33: палепшыць абястлушчванне кухоннага і сталовага посуду мыечнымі сродкамі (датычыцца ўсіх сталовых). Разнастаіць гарніры да другіх страў. Замяніць апрацоўчыя дошкі і заўсёды сачыць за іх санітарным станам (для ўсіх сталовых).

Адміністрацыйна - гаспадарчай частцы універсітэта і загадчыцы сталовай № 33 В. Куліковай укамплектаваць сталовую і буфет хімічнага корпуса неабходным тэхналагічным і халадзільным абсталяваннем.

В. Куліковай прыняць неабходныя меры да паляпшэння санітарнага стану сталовай галоўнага корпуса, сталовай і буфета хімічнага корпуса, забяспечыць своечасовы вываз тары са сталовых, узмацніць кантроль за якасцю прыгатавання ежы і яе асартыментам.

Галоўнаму ўрачу паліклінікі універсітэта наладзіць кантроль за санітарным станам сталовых і буфетаў.

## *НАКАЗ НАРОДНЫМ КАНТРАЛЁРАМ*

Канферэнцыя прадстаўнікоў калектыву БДУ заслухала і абмеркавала справаздачу аб рабоце галаўной групы народнага кантролю універсітэта. У сваёй пастанове-наказе яна адзначыла, што ГНК зроблена значная работа па ажыццяўленню важнейшых дырэктыў партыйных органаў. Разам з тым канферэнцыя ўказала на шэраг недахопаў у дзейнасці народных кантралёраў. ГНК у далейшым належыць паўней выкарыстоўваць свае правы і магчымасці для ўзмацнення кантролю за фактычным выкананнем дырэктыў партыі і ўрада па пытаннях вышэйшай адукацыі, навукова-даследчай работы, узмацнення дзяржаўнай дысцыпліны, выкаранення фактаў безгаспадарчасці і марнатраўства, праяў самазаспакоенасці. Патрэбна павысіць якасць і рэзультатыўнасць праверак, да іх правядзення прыцягваць прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікаў вучэбнага і навуковага аддзелаў, паліклінікі і іншых службаў. Неабходна ўстанавіць пастаянны кантроль за выкананнем рэкамендацый ГНК па праведзеных раней праверках, шырэй выкарыстоўваць сродкі галоснасці. Трэба размеркаваць абавязкі паміж кантралёрамі такім чынам, каб кожны з іх меў пэўны ўчастак работы, неабходна падтрымліваць цесны кантакт з «КП».

## КІРУЮЧЫ САСТАЎ ГНК УНІВЕРСІТЭТА

1. **І. ЦІШКЕВІЧ** (загадчык кафедры юрыдычнага факультэта) — старшыня ГНК.
2. **А. АНДРЭЕЎ** (дацэнт фізічнага факультэта)—член бюро, намеснік старшыні ГНК.
3. **А. АКІНЧЫЦ** (асістэнт хімічнага факультэта) — член бюро, намеснік старшыні ГНК.
4. **Л. КІРЫЛА** (в. а. дацэнта фізічнага факультэта)—член бюро, кіраўнік сектара вучэбнай работы.
5. **М. САКАЛОЎ** (дацэнт хімічнага факультэта) — член бюро, кіраўнік сектара навуковай работы.
6. **І. ГАЛАВАТЫ** (начальнік службы радыяцыйнай бяспекі) — член бюро, кіраўнік сектара аховы сацыялістычнай маёмасці.
7. **М. КНІГА** (дацэнт хімічнага факультэта) — член бюро, кіраўнік сектара быту.
8. **Г. ШУМАК** (выкладчык юрыдычнага факультэта)—член бюро, кіраўнік сектара па разгляду скаргаў і заяў і ўдасканалення работы кіруючага апарату універсітэта.
9. **Л. ПЯСТКОЎСКАЯ** (старшы бібліятэкар) — член бюро, сакратар ГНК.

СЕСІЯ — СЕСІЯ — СЕСІЯ

# ВЫПРАБАВАННЕ ЭКЗАМЕНАМ

Справа — ружы, злева — півоніі, а пасярэдзіне — экзаменацыйная ведамасць і пяць заліковак: жоўтая, аранжавая, чырвоная, зялёная і сіняя. Цішыня. Чуваць, як за акном, на плошчы, захлопваюцца дзверы аўтобусаў. А ў аўдыторыі — ні гуку, ні шоргату пер'яў — шарыкавыя ручкі працуюць бясшумна...

Так пачынаецца экзамен. Ведамасць сведчыць: палітэканомія капіталізму, III курс, 10 група механіка-матэматычнага факультэта. У першай пяцёрцы ўсе дзяўчаты. «Хлапцоў у нас (з 31 чалавека) толькі 8, мы іх павінны берагчы», — растлумачылі мне пасля экзамена. А яшчэ расказалі, што іх 10 група — самая «спартыўная» на факультэце: амаль кожны другі — спартсмен. Ну, тады яны павінны быць у добрай форме. Што прынясе ім сённяшняе выпрабаванне?

— Усё залежыць толькі ад саміх студэнтаў

Мы гутарым з экзаменатарам.

— А што вы, галоўным чынам, цэніце ў адказах?

— Веданне матэрыялу, уменне ўвязваць яго з надзённымі праблемамі сучаснасці, — пералічвае дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў Галіна Іванаўна Аляхновіч. — Яшчэ агульную эрудыцыю, логіку выкладання, асабістыя меркаванні, думкі, сваё разуменне працэсаў развіцця.

З Галінай Іванаўнай згодны і Аляксей Фёдаравіч Палікарпаў, асістэнт. Ён вёў у групе практычныя заняткі па палітэканоміі.

— Хто-небудзь гатоў? Калі ласка, Гуляшова!

Дзяўчына пачынае ціха, марудна. Увогуле, у выдатніцы Таісы Гуляшовай гэта звычайная форма адказу. Выкладчык павінен вызначыць, што тут: няўпэўненасць у ведах ці адна з рыс характару.

— У чым спецыфіка капіталістычнага ладу ў сельскай гаспадарцы?

— Дайце азначэнне рэнты.

— Ну, не бойцеся, смялей!

— Што такое тавар?

— А калі сказаць гэта больш дакладна?

Рука студэнткі міжволі выводзіць квадрацікі, кружочкі. А за дзвярыма за Таісу хвалююцца сяброўкі.

— Чатыры...

Засмучана. Здаецца, усё расказала, але... Экзаменатар строгі і патрабавальны.

У аўдыторыю ўваходзіць наступны студэнт, і на момант у пакой урываюцца гоман калідора, спрэчкі, смех, пытанні... Аб чым, вы думаеце, расказвае сябрам Сяргей Вядзернікаў? Аб дыферэнцыяльных рэнтах? Капіталістычнай эксплуатацыі?

— ...тэатр імя Массавета не часта прыязджае. Я ўчора глядзеў «Вачыма клоуна». Думаў, вярнуся з тэатра — яшчэ раз усе параграфы пералістаю. Дзе там! Спектакль зацягнуўся. Праўда, ігралі цудоўна. Цераханава, Бортнікаў...

— Гэта ўсё добра, але што такое эканамічны лад?

Дзяўчына кідаецца то да аднаго студэнта, то да другога. «Эканамічны лад? Няўжо гэта любімае пытанне?» — «Не ведаю...» — «Мне зараз заходзіць. А раптам на дэсерт — эканамічны лад?!» — «Вызначаецца спосабам вытворчасці...» — «Усё кончана, будзе «вудачка» — «Чаго памінкі спраўляеш раней тэрміну...» — «Ні пуху!..»

Экзамен не дарэмна параўноўваюць з боем мясцовага прызначэння. Праўда, няправільна вызначаюць «праціўнікаў». На экзамене ідзе бой паміж расслабляючымі і збіраючымі сіламі — унутранымі якасцямі студэнта. Перамога за тым, хто здолеў спалучыць волю і імкненне да выдатнай адзнакі, здолеў прымусіць свой мозг працаваць з поўнай аддачай. Такімі пераможцамі ў гэты дзень былі Г. Дубанос (першая пяцёрка), М. Анціпаў, У. Мікуцкі, А. Точка, Л. Шчарбакова, Г. Давыдоўская.

— Чытаў вельмі цікавую кнігу «Развіццё капіталізму ў Расіі», главы «Капіталу». — адзін са шчасліўчыкаў Анатоль Точка адказвае на маё пытанне, як ён рыхтаваўся да экзамена.

— Чытаць цікава, не аспрэчваю, — уступае ў размову Ніна Праневіч. — А закрыеш падручнік і... Усё ж такі мы не гуманітарыі.

— Але ж тым, напэўна, цяжэй разабрацца ў тонкасцях эканамічнай навукі. Хаця, канешне, палітэканомія — не зусім матэматыка...

— А вы заўважылі, што ў гэтую сесію мы здаём шмат «лірычных» дысцыплін: філасофію, палітэканомію, замежную мову?..

«Лірыка»? Але вось Лёні Лабоху давялося выводзіць формулу кругазвароту капіталу. Адзін за другім «ваявалі» студэнты з формуламі норм прыбытку, норм прыбавачнай вартасці. Грошы, грошы... Яны сталі каменем выпрабавання для Олі Ісаевай.

А між тым экзамен набліжаецца к канцу. Стрэлка гадзінніка паўзе ўніз. Апусцілі голаў ружы — Галіна Іванаўна нават не звярнула ўвагі (зазначу ў дужках, што ўсім прыгожым кветкам на злосць яна аддае перавагу прыгожым адказам).

— Чым адрозніваецца капіталістычная эксплуатацыя ад іншых відаў эксплуатацыі?

Цікава, што мала хто са студэнтаў захоўвае сваю індывідуальнасць перад сталом экзаменатара. У калідоры — гаваркія, спакойна-удумлівыя або гарэзлівыя. А пачнуць адказваць — збянтэжанасць, спалоханасць не дае сабрацца з думкамі. А часта бывае і наадварот.

...Гучыць апошні адказ. Іра Жыдзелева глядзіць, як рука экзаменатара выводзіць «добра» ў залікоўцы, усміхаецца: палітэканомія пакорана, але як настроіцца на наступны экзамен?

Галіна Іванаўна падводзіць вынікі. Зразумела, справа не столькі ў адзнаках, колькі ў трываласці і якасці ведаў студэнтаў. Які ж выкладчык не хоча, каб яго праца — лекцыі — не прапала ўпустую, дарэмна.

— Я працую ва універсітэце амаль дзесяць год, добра ведаю студэнцкую аўдыторыю, — Галіна Іванаўна папраўляе акуляры. — Палітэканомія — сама сацыяльная матэматыка. Яна блізкая да дакладных навук. Матэматыкі валодаюць вялікай сілай абстрактнага мыслення, працаваць з імі заўсёды цікава.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



**На здымку:** адказвае па білету Кацярына **Скіба**, староста 10-й групы.

Фота **Т. Петрашкевіч.**

# СУМАВАЦЬ НЕ ДАВОДЗІЦЦА

Не геафаку лепшай лічыцца I група эканамічнай геаграфіі III курса.

Гаворыць камсорг Тамара Тачоная:

— Чаму нас лічаць лепшымі? Напэўна таму, што з мінулага года ўтрымліваем I месца па вучобе на факультэце. Выдатнікаў у нас многа. Грамадскай работай занята большасць студэнтаў, і выконваюць яны яе з ахвотаю, добрасумленна. Дапамагае дружба.

Душой групы лічыцца староста Міхаіл Струк. Ён ахвотна дапоўніў расказ Тамары:

— Выдатна працуе ў нас акадэмсектар на чале з Зояй Шарабайка. Праводзяцца канферэнцыі СНТ. Мы наладзілі кантакт са студэнтамі геафака Вільнюскага універсітэта, абменьваемся вопытам. А наш шэфскі сектар курыруе ГПТВ № 47. Вельмі добрай ацэнкі заслугоўвае работа культмасавага і спартыўнага сектараў. Не раз праводзіліся таварыскія спартыўныя сустрэчы са спартсменамі інстытута народнай гаспадаркі.

Актыўна, цікава жыве I група эканамічнай геаграфіі. Справы, якія датычаць усіх, не пакідаюць месца для абыякавасці і суму.

У разгары — сесія. Рабяты прыкладаюць нямала намаганняў, каб захаваць першае месца за сабой. Ні пуху вам, студэнты, ні пер'я!

**Н. ПІСАЧУК,**
**студэнтка журфака.**

# ДАСЛЕДУЮЦЬ САЦЫЁЛАГІ

Праблематыка даследаванняў, якія праводзяць супрацоўнікі сацыялагічнай лабараторыі БДУ, надзвычай шырокая. У залежнасці ад характару разглядаемых пытанняў іх распрацоўка падзяляецца паміж чатырма сектарамі: праблем студэнцкай моладзі, сямейна-бытавых адносін, павышэння эфектыўнасці ідэалагічнай работы з насельніцтвам, сацыялогіі працы. У арсенале сродкаў, якімі карыстаюцца ў сваёй рабоце сацыёлагі,— анкеты, тэсты, інтэрв'ю, аналіз дакументаў (так званы кантэнт-аналіз). Акрамя вялікай навуковай каштоўнасці такога роду даследаванняў, трэба адзначыць іх прыкладное значэнне. Пасля вывучэння той ці іншай праблемы лабараторыя дае рэкамендацыі адміністрацыйным і грамадскім органам з мэтай павышэння іх дзейнасці ў разглядаемай сферы жыцця.

Так, напрыклад, у 1971—1974 гг. праводзілася даследаванне «Сацыяльная характарыстыка акадэмічнай групы ВНУ», у выніку якога былі выяўлены якасныя змены актыўнасці студэнтаў у залежнасці ад тэрміну і формы навучання, профілю факультэта, ВНУ. Вялікая ўвага была звернута на ацэнку студэнтамі дзелавых і сяброўскіх адносін у групе, на матывы выбару прафесіі. Выпрацаваныя пасля аналізу рэкамендацыі дапамаглі адміністрацыі вышэйшых навучальных устаноў і асабліва партыйным, камсамольскім арганізацыям пабудаваць сваю работу так, каб зрабіць студэнцкую групу сапраўдным калектывам юнакоў і дзяўчат, актыўным удзельнікам камуністычнага будаўніцтва.

Зараз сектар праблем студэнцкай моладзі праводзіць новае даследаванне, напрамак дзейнасці якога — вывучэнне фактараў, ад якіх залежыць грамадска-палітычная актыўнасць студэнтаў. Адначасова разглядаюцца такія пытанні, як дзейнасць куратараў у справе фарміравання ў студэнтаў камуністычнага светапогляду, эстэтычныя патрабаванні студэнтаў.

Вялікае значэнне маюць пытанні, якімі займаюцца сектары сацыялогіі працы і сямейна-бытавых адносін. Супрацоўнікі лабараторыі выступаюць з дакладамі перад насельніцтвам, дапамагаюць прадпрыемствам вырашаць праблему кадраў.

Часта найбольш цікавыя матэрыялы лабараторыі публікуюцца на старонках газет. Вялікую цікавасць у чытачоў выклікалі выступленні прафесара М. Г. Юркевіча ў «Литературной газете» і «Комсомольской правде».

Лабараторыі — 9 год. Зараз тут працуе 22 даследчыкі, сярод якіх нямала выпускнікоў сацыялагічнага аддзялення гістфака БДУ. Вялікую работу праводзяць заснавальнікі лабараторыі Л. Н. Дзічкоўская, В. Я. Качэргін, У. А. Дунаеў.

Можна з упэўненасцю сказаць, што малады калектыў лабараторыі яшчэ больш зблізіць навуку з жыццём, зробіць новыя крокі ў вывучэнні праблем, якія маюць вялікае значэнне для нашага грамадства.

**А. ТАРПАЧОЎ.**

# ДА СПРАВЫ — З СУМЛЕННЕМ

Не было раней на падрыхтоўчым аддзяленні прафсаюзнай арганізацыі. Прыйшлося, як кажуць, пачынаць з нуля.

На агульным сходзе выбралі бюро на чале са старшынёй А. Дзядком, і яно пачало працаваць.

Прайшоў час. Зараз, азіраючыся назад, можна ўпэўнена сказаць, што вынікі работы бюро станоўча адбіліся на рабоце прафсаюзнай арганізацыі аддзялення.

Ва ўсіх групах правялі ўлік і прыём у прафсаюз тых слухачоў, якія раней не састаялі ў ім.

Слухачам, у якіх узніклі цяжкасці з матэрыяльным становішчам, своечасова аказваецца дапамога.

Рэгулярна на падрыхтоўчым аддзяленні распаўсюджваюцца льготныя праязныя білеты на гарадскі транспарт.

Кожны месяц сумесна з камітэтам камсамола бюро ажыццяўляе кантроль за жыллёва-бытавымі ўмовамі слухачоў, пражываючых у інтэрнатах.

Адной з самых актыўных з'яўляецца другая група фізікаў. Напрыклад, на камуністычным суботніку, прысвечаным 106-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, па выніках працы яна заняла першае месца.

Вось і зараз у прафбюро падрыхтоўчага аддзялення шмат работы. На апошнім пасяджэнні вырашалася пытанне аб размеркаванні пуцёвак на летнія месяцы ў прафілакторый, дамы адпачынку і спартыўна-аздараўленчы лагер «Нарач».

Выступаючы на XXV з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў сказаў аб ролі прафсаюзаў так:

«Прафсаюзам адводзіцца ў жыцці нашага грамадства вялікае месца. І іх гэта да многага абавязвае. Работа прафсаюзаў павінна быць арганізавана такім чынам, каб яна паўней адпавядала іх правам і ступені іх адказнасці».

Гэтым напрамкам і кіруецца ў сваёй працы прафсаюзнае бюро падрыхтоўчага аддзялення.

**У. ДЗЯТЧЫК,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення журфака.**

# ГРУПА, У ЯКОЙ ЦІКАВА

ШТО ЗВЯЗВАЕ людзей у калектыве? Агульная справа? Вучоба? Так! Але ёсць яшчэ нейкія нябачныя, але вельмі моцныя ніці.

Цяжка разабрацца, чаму адна група жыве адной сям'ёй, дружна, а ў іншай — кожны сам па сабе. Можа гэта залежыць ад асабістых якасцей аднаго чалавека, які здольны аб'яднаць, згуртаваць усіх. А можа ад асабістых якасцей кожнага. І ў выніку атрымаецца так: пашанцавала — сабраліся ў групе рабяты цікавыя, разумныя, уважлівыя. І ёсць калектыў, узаемаразуменне. І нават калі хто-небудзь не можа жыць і рабіць усё разам, яны навучаць гэтаму, і ты не будзеш у іх асяроддзі лішнім.

Чацвёртай падгрупе фізіялогіі чалавека і жывёл 2-й групы III курса біяфака ў такім разе пашанцавала. Гэта адзін з лепшых калектываў на факультэце, хоць і зусім маленькі — усяго 11 чалавек.

Чамусьці адразу ж знайшлі рабяты агульную мову і пасябравалі. Чыя ў гэтым заслуга? Можа быць, старасты Толі Чумака? Магчыма!

Пазнаёмілася я з групай нядаўна і не так многа была з імі разам, але адразу ж адчула таварыскія і нейкія па-асабліваму ўважлівыя адносіны студэнтаў да Толі. На думку рабят, староста ў першую чаргу павінен валодаць такімі якасцямі, як назіральнасць і чуласць. І ўсе як адзін згадзіліся, што гэтыя, а таксама многія іншыя станоўчыя якасці складаюць партрэт Толі Чумака.

Ну, а як лічыць сам Толя?

— Староста павінен быць перш за ўсё студэнтам сваёй групы, хоць і не павінен ісці ў яе на паваду. Калі ён будзе выказваць інтарэсы групы, яго будуць паважаць і ў дэканаце.

Магчыма, што гэта Толя адыграў вялікую ролю ў з'яднанні рабят, а можа быць, гэта вынік маленькага ўкладу кожнага. А хутчэй за ўсё — і тое, і другое. Усе былі аднадушны — так, група дружная! І гэта адчуваецца хоць бы па таму асабліваму настрою добразычлівасці і ўзаемадапамогі, калі кожны паводзіць сябе ў групе лёгка і проста, калі няма груповак.

Ёсць у групе і свой актыў, кожны ў чымсьці завадзіла. Сабрацца разам пасля заняткаў некалькі складана. Але, хоць і не часта, рабяты ходзяць разам і ў кіно, і ў тэатр, знаходзяць час і магчымасць. У кожнага, зразумела, ёсць таварышы і знаёмыя і па-за універсітэтам, але староста Толя Чумак выказаў агульную думку:

— З групай лепш. Ва ўсіх рабят асноўныя інтарэсы супадаюць. Добра ведаючы кожнага, лёгка зразумець, што чалавек хоча ад цябе; заўсёды ёсць тэма для гутаркі.

Вучоба — галоўнае для студэнта. 4-я падгрупа і ў гэтых адносінах на высокім узроўні. У ёй тры выдатнікі. Староста і тут не падводзіць сваіх таварышаў: ён адзін з траіх. Не адстаюць ад яго А. Шашко і І. Бандар. «У моцнай групе лёгка вучыцца», — гавораць рабяты. Але, на думку Толі Чумака, сесію рабяты могуць здаваць яшчэ лепш. У кожнага для гэтага ёсць патэнцыяльныя магчымасці. Выкарыстанне гэтых магчымасцей—адна з задач групы на сённяшні дзень.

Цікава праходзяць у групе камсамольскія сходы. Мне ўдалося пабываць на адным з іх, дзе студэнтам трэба было вызначыць кантрольны бал кожнага. Рабяты без крыўды слухалі сваіх таварышаў і гаварылі тое, што думалі. А гэта ж, напэўна, самае галоўнае — прынцыповасць і сумленнасць ва ўзаемаадносінах. Тады не будзе ў групе сварак і канфліктаў.

Канешне, ідэальных груп не бывае. У кожнай — свае асабістыя праблемы, свае цяжкасці. Узаемаразуменне, з'яднанасць, прыхільнасць адзін да аднаго прыходзяць з часам.

— Ідэальная група, — гаворыць Толя Чумак, — гэта калі ўсе адзін аднаго добра разумеюць і адзін аднаму давяраюць. Але лепш за ўсё — гэта наша зямная, і не патрэбны нам ідэальныя. Самі дарасцём да ўзору!

**С. КАВАЛЕЎСКАЯ.**

XXIV АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ СПАРТАКІЯДА

# СТАРТУЕ ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

Два дні на стадыёне універсітэта працягвалася напружаная барацьба на першынство БДУ па лёгкай атлетыцы. І калі ў першы дзень спаборніцтваў паказаць добрыя вынікі спартсменам перашкодзіла надвор'е, то ў другі яны парадавалі балельшчыкаў высокімі вынікамі.

Сур'ёзную заяўку ў першы ж дзень спаборніцтваў зрабіў студэнт І курса механіка-матэматычнага факультэта І. Пыж. У напружанай бескампраміснай барацьбе з прызнаным лідэрам сярэдняй дыстанцыі І. Сянчэнем ён здолеў вырваць перамогу, а назаўтра паўтарыў свой трыумф: быў першым у бегу на 800 м.

Хочацца адзначыць упэўненую перамогу на спрынтэрскіх дыстанцыях 100 м і 200 м студэнткі ФПМ Іны Міскевіч. Безумоўна, роўных ёй на дарожцы не было. На стометроўцы яна паказала вынік 12,5 сек., на двухсотметровай дыстанцыі — 25,6 сек.

Гарачы паядынак разгарэўся ў фінальным забегу на 100 м сярод мужчын. Цікавасць да спрынтэрскіх дыстанцый наогул не выпадковая: спрынт захапляе сваёй дынамічнасцю, да дробязей адшліфаванай тэхнікай і, галоўнае, хуткасцю. Цікавасць да гэтага забегу абумоўлівалася і тым, што ў ліку фіналістаў аказаліся даўнія саперніκі — студэнт хімфака С. Рахманаў і студэнт фізічнага факультэта У. Шакін. Даецца старт — спартсмены імкліва набіраюць хуткасць. Здаецца, С. Рахманаў выходзіць наперад. І толькі на апошніх метрах стала відавочным: У. Шакін — чэмпіён універсітэта. Яго час — 11,4 сек. Вынік, зразумела, не высокі, але трэба сказаць, спартсмены беглі супраць моцнага ветру.

Не менш цікавай была барацьба і на другой спрынтэрскай дыстанцыі ў мужчын — двухсотметровай. Тут спрэчку за першае месца павялі С. Версан (гістфак) і М. Наумовіч (ФПМ). Гэтыя спартсмены фінішавалі з аднолькавым вынікам — 23,4 сек., падзяліўшы першае і другое месцы.

Бадай, найбольшую ўвагу балельшчыкаў прыкавалі да сябе «шведскія» эстафеты. У жанчын у гэтым відзе праграм прадугледжваюцца чатыры этапы: 400 м, 300 м, 200 м, 100 м. У мужчын — 800 м, 400 м, 200 м, 100 м. Роўна выступала на ўсіх этапах мужчынская каманда хімічнага факультэта ў саставе І. Сянчэні, С. Рахманава, І. Шчэрбы, М. Русневіча і тым самым забяспечыла сабе першае месца, намнога абышоўшы другога прызёра — каманду юрыдычнага факультэта. У жанчын у гэтым відзе праграмы перамагла каманда ФПМ у саставе В. Скляравай, І. Міскевіч, А. Кандрашовай і Т. Макарчыкавай.

Дарэчы, В. Склярава стала ў гэтых спаборніцтвах чэмпіёнкай універсітэта на дыстанцыях 400 м і 800 м, паказаўшы адпаведна 1.01.2 мін. і 2.22.4 мін.

У скачках у вышыню былі паказаны нядрэнныя вынікі. У жанчын лёгка перамагла студэнтка біяфака Л. Клімянцёнак (170 см). У мужчын пераможцай стаў В. Петрушкевіч (фізфак) з вынікам 195 см.

У камандным заліку пасля першага дня спаборніцтваў упэўнена лідзіравала каманда фізічнага факультэта — 151 ачко. І да канца спаборніцтваў гэты дружны калектыў не здаў сваіх пазіцый. З агульным вынікам 375 ачкоў ён заняў першае месца, апярэдзіўшы каманду механіка-матэматычнага факультэта, якая заняла другое месца, на 54 ачкі. У поспеху каманды немалая заслуга адказнага за фізічнае выхаванне і спорт В. Нікіціна.

Няроўна выступіла адна з мацнейшых каманд універсітэта — зборная хімічнага факультэта. Ёй прыйшлося пацясніцца на пятае месца. Трэцяе месца ў камандным заліку за гісторыкамі. Ніжэй сваіх магчымасцей выступілі юрысты, біелагі.

На жаль, не абышлося і без «сюрпрызу». Каманда філалагічнага факультэта наогул не прыняла ўдзелу ў спаборніцтвах. Чым гэта растлумачыць — невядома.

— Абыякавыя адносіны да спартыўных мерапрыемстваў з боку В. Мурашова, адказнага за фізвыхаванне на філфаку, павінны хваляваць не толькі кафедру фізічнага выхавання універсітэта, але і камсамольскую, партыйную арганізацыі на самім факультэце, — сказала пасля заканчэння першынства галоўны сакратар спаборніцтваў В. Зарэцкая.

Увогуле спаборніцтвы былі арганізаваны належным чынам. Для спартсменаў былі створаны па-сапраўднаму спартыўныя ўмовы. Судзейская калегія на чале з А. Міхнаўцом працавала зладжана, беспамылкова.

Спаборніцтвы закончыліся. Яны паказалі, што ва універсітэце многа таленавітых спартсменаў, здольных паказваць высокія вынікі. Шчаслівых стартаў ім!

**Р. КІСЕЛЬ,**
**С. КАГАН.**

# ІНТЭРФАК

І верасня 1961 года быў адкрыт падрыхтоўчы факультэт БДУ па навучанню замежных грамадзян. І вось ужо пятнаццаць год ён рыхтуе моладзь краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі для паступлення ў ВНУ усіх гарадоў Савецкага Саюза.

Студэнты факультэта вывучаюць праграму сярэдняй школы па матэматыцы, хіміі, рускай літаратуры, чарчэнню, фізіцы і іншых дысцыплінах. Усё гэта выкладаецца на рускай мове, і для таго, каб замежныя грамадзяне лепш разумелі выкладчыкаў, арганізаваны спецыяльныя заняткі па рускай мове. Яны праводзяцца штодзённа, па чатыры гадзіны ў суткі.

Сёння на падрыхтоўчым факультэце БДУ вучыцца 257 студэнтаў з 34 краін.

У вольны час студэнты адпачываюць у аздараўленча-спартыўным лагеры, дзе ім прадастаўлены ўсе ўмовы для заняткаў спортам. Летам многія з замежных студэнтаў прымуць удзел у трэцім працоўным семестры. У адзін з СБА універсітэта ўвойдуць 12 студэнтаў з Індыі, якія займаюцца на падрыхтоўчым факультэце БДУ. Некаторыя студэнты праводзяць свой летні адпачынак у лагеры на возеры Нарач. Пасля адпачынку яны раз'едуцца па розных кутках нашай краіны, каб пачаць вучобу ў ВНУ.

**В. МАРТЫНЕНКА,**
**слухач вячэрніх падрыхтоўчых курсаў.**

# ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ





ЛЕНІНГРАД!.. Гэта слова блізкае кожнаму савецкаму чалавеку. Ён здзівіў свет падзеямі 1917 года, ён і сёння здзіўляе нас сваёй прыгажосцю.

**НА ЗДЫМКАХ:**

Галоўны каскад фантанаў Петрадварца; Дварцовая плошча.

Фота Э. Ішуціна.

# ЯРКА, НАГЛЯДНА, ПЕРАКАНАЎЧА

Ці часта мы, знаёмячыся з чарговай кніжнай выстаўкай у галоўным корпусе універсітэта, задумваемся аб тым, як яна нараджаецца, якая вялікая, карпатлівая праца работнікаў бібліятэкі ўкладзена ў гэтую справу. Даволі нялёгка адлюстраваць актуальную тэму, падабраць кнігі з густам, прыгожа афарміць. Не памыляецца той, хто лічыць, што гэта работа творчая і, як ва ўсякай творчасці, тут патрэбен талент.

Кніжныя выстаўкі БДУ... Кожны знаходзіць тут штосьці неабходнае і патрэбнае для сябе, цікавае і захапляючае.

Работнікі бібліятэкі, праглядваючы перыёдыку, адзначаюць публікацыі па хвалюючых моладзь пытаннях. І вось паяўляецца выстаўка аб жыцці равеснікаў за мяжой, іх удзеле ў барацьбе за незалежнасць сваіх краін. Глыбокаму раскрыццю тэмы, рашэнню задач духоўнага выхавання садзейнічае цыкл выставак, прысвечаных барацьбе Камуністычнай партыі. Што азначае — быць інтэрнацыяналістам-ленінцам у нашы дні? Як ажыццяўляецца Праграма міру? На ўсе гэтыя пытанні выстаўкі даюць змястоўныя, вычарпальныя адказы.

Але вось тэма вызначана. Цяпер неабходна звярнуцца да кніжнага фонду, знайсці неабходны матэрыял, аддзяліць галоўнае ад другараднага. Але выбар тэмы і літаратуры — гэта яшчэ не ўсё. Наступны этап — складанне плана выстаўкі.

Заглянем на тэматычную выстаўку, прысвечаную сусветнаму дню аховы акружаючага асяроддзя — «І нам, і нашчадкам» з раздзеламі: аб прававой і навуковай асновах аховы прыроды, аб народнагаспадарчым значэнні аховы прыроды, аб узаемаадносінах людзей з прыродай. Выстаўка прыгожа аформлена, багата ілюстравана, насычана цікавым матэрыялам. Хіба не прыцягнуць увагу чытача наступныя кнігі: «Даследаванне жывёл Амерыкі», «Асваенне глыбінь акіяна», «Да таго, як памрэ прырода», «Чалавек выпраўляе планету».

— Выставачная работа — планавая работа, — сказала нам галоўны бібліятэкар аддзела абслугоўвання, адказная за выстаўкі навуковага абанемента Зінаіда Максімаўна Шалупенка. — Асаблівай папулярнасцю ў гэтым навучальным годзе ў студэнтаў карысталіся наступныя цыклы выставак: «Са скарбніцы марксісцка-ленінскай думкі», «Духоўнае выхаванне», «У дапамогу вучэбнаму працэсу», «Студэнту-практыканту», «Сучасная матэматыка — навуцы і тэхніцы», «Фізіка і навукова-тэхнічны прагрэс», «Вам, першакурснікі», «Аб педагагічным майстэрстве», «Кібернетыка — навука вялікіх магчымасцей» і г. д.

Уся работа па планіроўцы арганізацыі выставак праводзіцца пад кіраўніцтвам дырэкцыі і загадчыкаў аддзелаў. Літаратура з выставак карыстаецца вялікім попытам у чытачоў. Перыядычнасць выставак — у сярэднім 9 разоў у месяц. Прагляд выстаўкі — ад 5 да 10 дзён.

Да ліку лепшых афарміцеляў выстаўкі належаць бібліятэкары Л. Пясткоўская і Л. Зайцава.

**Л. БАРАН,**
**Т. ЗАХАРАВА,**
**студэнткі журфака.**

ЛІСТОК ДАІ

# КАБ НЕ БЫЛО АВАРЫЙ

Моталюбіцелі заўсёды дастаўлялі шмат клопатаў Дзяржаўтаінспекцыі. У мінулым годзе, напрыклад, у Мінску было зарэгістравана 75 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам вадзіцеляў мотатранспарту. Галоўная прычына гэтых аварый — няўважлівасць у канкрэтных дарожных умовах.

У гэтым годзе моталюбіцелі ўжо адкрылі свой «лік». 4-га красавіка інжынер-эканаміст Мінскага аўтазавода В. Ліцяшэўскі на кальцавой дарозе зрабіў наезд на сямікласніка адной з мінскіх школ. Хлопчык папаў у бальніцу. Папярэдняе следства ўстанавіла, што вадзіцель па тэхнічных прычынах не мог пазбегнуць наезду, але, па-першае, Ліцяшэўскі не меў вадзіцельскіх праў, па-другое, з месца здарэння скрыўся, дапамогі пацярпеўшаму не аказаў. У мінулым годзе 44 вадзіцелі, зрабіўшыя дарожна-транспартныя наезды, скрываліся. Усе яны былі хутка знойдзены і панеслі пакаранне.

Аўталюбіцельскі сезон толькі пачынаецца, і ад кожнага вадзіцеля патрабуецца няўхільнае выкананне дарожнай дысцыпліны.

**М. РАБЫЙ,**
**старшы інструктар ДАІ Мінска.**

# ХТО ДАПАМОЖА ЗАЙЦУ?

БЫЛЬ

— Заяц, заяц! Глядзіце! — павіслі ля пешаходнага скрыжавання словы.

— Дзе?..

Усё гэта злівалася і раставала ў гарачым подыху мітуслівага жыцця горада, размаляванага, з мноствам рэклам. Горад уцягваў у сябе шум вуліц, пах выхлапных труб аўтамабіляў, горад пабліскваў у іскрыстай беласнежнай усмешцы снегу. І нам здалося, быццам горад так і імкнецца сабраць гэтыя гукі на зямлі і зліць у адзіную мелодыю.

Мы з непрытоеным хваляваннем уставіліся туды, куды пацягнуліся погляды, пальцы выцягнутых рук асобных прахожых.

Па шырокай вуліцы ў бясконцай чарадзе беглі машыны. І таму кожны з нас не адразу заўважыў жывы камяк, які каціўся сярод машын у наш бок.

Гэта і быў заяц. Ён бег, высока ўскідваючы заднія ногі, сціснуты з двух бакоў машынамі. Заяц спрабаваў выскачыць з гэтай гудзячай пасткі, але кожны раз, натыкаючыся на бакі машын, зноў вяртаўся ў вузкі астаўлены калідор. Пасля кожнай такой спробы заяц усё больш выбіваўся з сіл. У ім прыкметней станавілася тая стомленасць, што прыходзіць ад нялёгкай барацьбы за жыццё. І варта яму было зрабіць тыя неразлічаныя, недакладныя скачкі ў бок, як тут жа...

— Відаць, збег ад кагосьці, бядовы, — заключыла адна з жанчын. Паблізу стаяўшы мужчына выдзьмуў з сябе ў тон ёй свае мнагазначнае:

— Гм-м, да...

Светафор спыніў машыны. І ў той жа час дзвюма лентамі праз пераход пацягнуліся пешаходы.

Мы ўжо дасягнулі сярэдзіны пераходу, калі заяц у адчаі кінуўся да людзей.

Тое, што здарылася там, працягвалася ўсяго некалькі мінут. Пазней мы дамовіліся аб гэтым проста не ўспамінаць, забыць, выкрасліць з памяці. І не змаглі.

Мы бачылі, як заяц яшчэ не паспеў параўнацца з пешаходамі, а ў яго ўжо нехта кінуў саквяж і, на шчасце, прамахнуўся. Знайшліся і такія, што спрабавалі злавіць серака. Ад удару зайца занесла ў бок. Перапалоханы, ён ускочыў на ногі і пад чыйсьці маладзецкі прысвіст хутка стаў уцякаць.

Яшчэ доўга мы глядзелі ўслед даўшаму драпака зайцу. Якім жа будзе наступнае скрыжаванне ў серака?..

**Н. КУРГАНСКІ,**
**В. ДЗЯТЧЫК,**
**студэнты.**

В. а. рэдактара
В. А. ВОЛЬСКІ.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 01237 Заказ № 859.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.